УДК 94(476) “1919/1920”

# ЖЫЦЦЁ ПІНСКА ПАДЧАС ПОЛЬСКА-САВЕЦКАЙ ВАЙНЫ Ў 1919–1921 гг

***Сяргей Ісакаў***
*Цэнтр ваеннай гісторыі Беларусі, Інстытута гісторыі НАН Беларусі, Мінск, Беларусь*
isakow.sergei@yandex.ru

У артыкуле распавядаецца пра фарміраванне і дзейнасць пінскага магістрату ў 1919–1920 гг. Таксама разглядаюцца паўсталыя праблемы з фарміраваннем адмінастрацыі, забяспячэннем харчаў і інш. Артыкул прысвечаны ў першую чаргу спецыялістам – даследчыкам гісторыі польска–савецкай вайны, гісторыкам, а таксама ўсім зацікаўленным у вывучэнні невядомых старонак гісторыі свайго краю.

***Ключавыя словы: магістрат, бургамістр, насельніцтва, дапамога***

# LIFE IN PINSK DURING THE POLISH-SOVIET WAR OF 1919–1921

***Sergei A. Isakov***
*Center for Military History of Belarus, Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

The article tells about the formation and activity of the Pinsk magistrate in 1919–1921. Problems with the formation of administration, food security, etc. are also considered. The article is devoted primarily to specialists - researchers of the history of the Polish-Soviet war, historians, as well as all those interested in studying the unknown pages of the history of their region.

***Keywords: magistrate, mayor, population, assistance***

На працягу 1915–1921 гг. Пінск быў заняты войскамі кайзераўскай Германіі, Украінскай Народнай Рэспублікі, Рабоча-сялянскай Чырвонай арміяй і Войскам Польскім. Баявыя сутыкненні паміж падраздзяленнямі польская “самааховы” і Рабоча-сялянскай Чырвонай арміяй пачаліся ў студзені 1919 г., у лютым дайшло да першых баёў паміж рэгулярнымі падраздзяленнямі. З гэтых падзей пачалася неаб’яўленная польска–савецкая вайна 1919–1921 гг. 5 сакавіка 1919 г. Пінск быў заняты падраздзяленнямі Падляшкай группы войск А. Лістоўскага [1, с. 400]. У горадзе ўсталявалася ваенная адміністрацыя на чале з маёрам А. Лучынскім. Была ўведзена каменданцкая гадзіна. Праз некалькі дзён быў створаны орган самакіравання – магістрат з 12 асоб, у які патрапілі былыя прадстаўнікі гарадской управы часоў Расійскай імперыі.

Насельніцтва Пінска было неаднародным і па дадзеных першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г. складала 28 368 чалавек [2]. З якіх 20 957 з’яўляліся яўрэямі, 3 625 рускімі, 1 939 палякамі і 1 420 беларусамі і г.д. Большасцю з’яўляліся яўрэі 73,87 працэнтаў, рускія – 12,77, палякі – 6, 83, беларусы – 5, іншыя – 1,53 працэнтаў. Ва ўмовах баявых дзеянняў 1915–1920 гг., вымушанай эміграцыі – гэта прывяло да скарачэння колькасці насельніцтва. У 1920 г. насельніцтва Пінска складалася з 21 436 чалавек. Працэнтныя суадносіны былі наступнымі: павялічыўся працэнт яўрэскага насельніцтва – 82,1; палякаў – 7,95; беларусаў – 3,27 і інных – 7, 52 [3, p. 16] (атрымліваецца 100,84 працэнты). У сувязі з эвакуацыяй у 1915 г. рускага чынавенства і духавентсва зменшыўся працэнт рускіх у горадзе, і ў сваю чаргу павялічыла працэнт яўрэскага насельніцтва. З прыходам польскай адміністрацыі павялічыўся і працэнт палякаў. Перш за ўсё сюды ехалі (з тэрыторыі этнічнай Польшчы) польскія чыноўнікі, якія займалі пасады ў магістраце і мясцовай радзе, чыноўнікі Грамадзянскага Упраўлення Усходніх Зямель, вайскоўцы, каталіцкае духавенства і крыху настаўнікаў.

Пінскі магістрат складаўся ў 1919 г. з бургамістра Б. Барысевіча, лаўнікаў С. Кагля, М. Паўлоўскага і Я. Слуцкага, сакратара Ф. Мелеха, падсакратара О. Янцевіча і радных А. Пальчэўскага, Я. Мінковіча, доктара Кавальскага, Г. Цімафеева, К. Качэўніка, ксяндза і дэкана С. Войціка [4, арк. 41; 5, арк. 15; 6, арк.

40]. Орган самакіравання вырашаў пытанні, якія датычыліся жыцця горада і бліжэйшых да яго гмін. Рада вырашала розныя праблемы. Бюджэт складаў з 150 000 марак штомесячна.

На паседжанні магістрату 17 снежня 1919 г. з падачы каталіцкага духавентсва горада, патрэбна было перанесці рынкавы дзень на іншы. Праблема палягала ў тым, што падчас правядзення службаў у кафедральным касцёле Святога Станіслава ў нядзелю, адбываўся жвавы гандаль, які мяшаў каталіцкаму духавентву ў правядзенні службаў. Было вырашана праводзіць рынкавы гандаль у сераду і пятніцу, абмінуючы святочныя дні для каталікоў і праваслаўных – нядзелю і суботу для яўрэяў.

Адной з галоўных праблем у 1919–1921 гг. была праблема з забяспячэннем харчавання ў горадзе і павеце. Для вырашэння гэтай праблемы быў створаны аправізацыйны аддзел. Які за перыяд з сакавіка 1919 па 1 студзеня 1920 г. прадаў на 10 000 000 рублёў прадукцыі (з улікам коштаў на 1919 г. 70 000 000 рублёў):

**Табліца 1. Прададзена тавараў у Пінску з сакавіка 1919 – студзень 1920 гг**[4, арк. 14 адв.]

| Тавар | Колькасць у пудах |
|---|---|
| Пшанічная мука 1 сорту | 60000 пудоў (960 000 кг) |
| Жытняй змельчонай мукі | 9000 (144 000 кг) |
| Жытняй мукі | 3000 (48 000 кг) |
| Жыта | 4500 (72 000 кг) |
| Цукру | 3500 (56 000 кг) |
| Круп і фасолі | 10000 (160 000 кг) |
| Бульбы | 131000 (2 096 000 кг) |
| Солі | 50000 (800 000 кг) |
| Тлушчу і саланіны | 10000 (160 000 кг) |
| Селядцу | 75 бочак |

Аднак не кожнага былі грошы на пакупку ежы, асабліва ў тых, хто пачаў вяртацца з вымушанай міграцыі. Для вырашэнне гэтай праблемы, і забяспачэнні найбольш пацярпелых падчас Першай сусветнай вайны 7 гмін каля Пінска: Хойнаўскай, Жабчыцкай, Ставоцкай, Бродніцкай і Пінкавіцкай цалкам, і Лагішынскай і Лемяшэўскай часткова было вырашана выдаць прадукцыі на 500 000 рублёў.

**Табліца 2. Раздадзеная прадукцыя ў 7 гмінах цалкам і 2 часткова**[4, арк. 15.]

| Тавар | Колькасць у пудах |
|---|---|
| пшанічная мука | 25000 пудоў (400 000 кг) |
| сала | 350 (560 кг) |
| бульба | 3000 (48 000 кг) |
| жытняя мука | 820 (13 120 кг) |

Аднак гэтай дапамогі катастрафічна не хапала. Як у сваёй справаздачы адзначаў бургамістр Пінска Station Браніслаў Барысевіч, што горад не зможа гаспадарча аднавіцца без дапамогі, насельніцтва горада знаходзіцца ў галечы [6, арк. 39.]. Людзі не могуць знайсці працу і атрымліваць грошы для пакупкі ежы, з-за гэтай прычыны ў горадзе пануе голад і хваробы. Наступнай праблемай у горадзе была прастытуцыя. Для вырашэння гэтага пытання, была прыцягнута паліцыя і мясцовыя дактары. Першыя павінны былі выяўляць і рэгістраваць грамадзян, якія займаліся гэтай справай. Дактары павінны былі кожны тыдзень у суботу праводзіць агляды і лячыць інфекцыйныя захворванні перададзеныя палавым шляхам [5, арк. 15]. Аднак гэтыя загады не прывялі да пажаданых вынікаў.

Грамадска–палітычнае жыццё ў горадзе поўнасцю кантралявалася польская ваеннай адміністрацыяй. Пры выданні яўрэйскіх, рускіх і іншых газет, яны праходзілі абавязковую ваенную цэнзуру, якая магла выразаць непажаданныя артыкулы, або поўнасцю канфіскаваць наклад. Жыццё гурткоў і таварыстваў поўнасцю залежала ад мясцовых чыноўнікаў у магістраце. Працэдура стварэння любой арганізацыі складалася з таго, каб пры дазволе мясцовай адміністрацыі абдыўся сход зацікаўленных людзей. Потым на гэтым сходзе выбіралась кіраўніцтва арганізацыі, і складаўся спіс радавых членаў з подпісам кожнага. Для зацвярджэння арганізацыі, патрэбна было скласці 2-3 экземпляры статута, у якіх прапісваліся мэты, задачы і іншыя пытанні, якія датычыліся дзейнасці. Пасля гэтага статуты перадаваліся спачатку павятоваму старасце, потым акруговаму камісару. Апошняй інстанцыяй у прыняцці рашэння аб адкрыцці арганізацыі з'яўляўся генеральны камісар ГУУЗ, або яго намеснік. Дакладна вядома, што ў Пінску працавала земляробчае і земляробча-гандлёвае таварыства, у склад якога ўваходзілі: Шчыт, Катовіч і Ганна Орда [4, арк. 13], пінскі саюз каапературыаў і інш. Галоўным прадпрыемстваў горада з'яўлялася запалкавая фабрыка Галперна.

Адносіны да польскай адміністрацыі насельніцтва горада былі розныя. Так у сваёй справаздачы за 12 кастрычніка 1920 г. наместнік бургамістра распавядаў, што праваслаўнае насельніцтва ў горадзе ставіцца да ўлады негатыўна, а павета больш прыхільна [7, арк. 123 адв.]. Прыхільнасць насельніцтва тады зводзілася да аднаго. Калі падчас заняцця гораду рабавалась насельніцтва, то стаўленне было негатыўнае. Былі прымусовыя рэквізіцыі або не.

З 23 ліпеня па 26 верасня Пінск быў заняты савецкімі войскамі, усталёўвалася савецкая ўлада. Для кіравання горадам быў створаны павятова-гарадскі рэўкам. Аднак савецкая ўлада праіснавала нядоўна. 26-27 верасня 1920 г. аператыўная група С. Булак-Балаховіча авалодала горадам. У першым жа загадзе аб 28 верасня 1920 г. было згадана, што ўся грамадзянская ўлада перадаецца выбарнаму гарадскому самакіраванню [8, арк. 1].

З прыходам польскай адміністрацыі, арганізоўваліся і новыя арганізацыі. У верасні 1920 г. было створана "Таварыства полек", задчай якога было абслугоўванне польскіх салдат. Пры ім былі створаны: чайная, пральня, чытальня і сталоўка. Наступная арганізацыя была "Крэсы", задачай якой была культурна–асветная праца. Вакол гэтай арганізацыі гуртавалася мясцовая інтылегенцыя. У Пінску таксама дзейнічалі і міжнародныя дабрачынныя арганізацыі: Амерыканскі Чырвоны Крыж (American Red Cross), Амерыканская адміністрацыя дапамогі (American Relief Administration), Амерыканскі яўрэскі аб'яднаны камітэт (Joint), Польска–Амерыканскі камітэт помачы дзецям і інш. Іх дзейнасць была звязана з пастаўкай ежы, адзення і дапамогі ў адкрыцці медыцынскіх устаноў, сталовак. Так дзеяч беларускага народнага руху Р. Астроўскі займаў у 1920 г. пасаду кіраўніка амерыканскай кухні для дзяцей у Пінску [10, с. 108].

У 1920 г. у г. Пінск з эміграцыі вярнуўся (з Амерыкі) святар Іван Паўлавіч, які фактычна заснаваў першую Пінскую евангельскую царкву. У 1920-1921 гг. евангельская царква ў Пінску пачала сваё распаўсюджанне на тэрыторыю павета. У в. Ставок, Лосічы, Таргашыцы, Любель, Завідчыцы, Жытнавічы і інш. пачалі ствараца абшчыны. Першыя сабранні евангелістаў адбываліся ў доме Юзефа і Марыі Красінскіх. Выступленне пастыр праводзіў на Рынкавай плошчы, дзе новая вера і надзея на выратаванне, пашыралася сярод сялянства падчас правядзення таргу. Колькасны склад веруючых пачаў павялічвацца.

Пінск займаў падчас польска-савецкай вайны 1919-1921 гг. важнае стратэгічнае значэнне. Ён быў на стыке паўночнай і паўднёвай аператыўнай прасторы вядзення баявых дзеянняў. Польскае кіраўніцтва лічыла яго ключом ад Палесся. Таму акрамя ваенных дзеянняў, тут было вырашана зрабіць стаўку на грамадзянскую адміністрацыю. Аднак галоўная праблема палягала ў тым, што нацыянальнай большасцю ў горадзе з'яўляліся яўрэі, якія поўнасцю кантралявалі гандаль і прамысловасць. З прыходам польскіх войск у горад пастаянна адбываліся пагромы яўрэйскага насельніцтва, рэквізіцыі і інш. З-за гэтых падзей, яўрэі былі настроены негатыўна да новай адміністрацыі. Не дапамагло выдзялення большасці месцаў у магістраце і мясцовай радзе. Другой акалічнасцю Пінска з'яўляецца тое, што ў 1919–1921 гг. сталі прыбываць польскія чыноўнікі, каталіцкае духавентсва і настаўнікі, якія пачалі фарміраваць мясцовую інтылегенцыю.


1. Гісторыя Пінска. Ад старажытнасці да сучаснасці: да 915-й гадавіны з першага летапіснага ўпамінання / А.М. Літвін [і інш.]. – Мінск: Выш. Шк., 2012. – 711 с.
2. Демоскод [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.demoscope.ru/weekly/ssp/rus_lan_97_uezd.php?reg=780. – Дата доступу: 27.01.2022.
3. Spis ludnosci na terenach administrowanych przez Zarzad Cywilny Ziem Wschodnich, grudzien 1919 / Lwów: Ksiaznica Polska T-wa Naucz. Szkól Wyzszych, 1920. – 49 p.
4. Дзяржаўны Архіў Брэсцкай вобласці (ДАБр). – Ф.2001. – Воп. 1. – Спр. 14. Пратаколы паседжанняў магістрату і гмінных рад: спісы членаў гмінных рад.
5. ДАБр. – Ф.2001. – Воп. 1. – Спр. 6. Пратаколы паседжанняў магістрату і гмінных рад: спісы членаў гмінных рад.
6. ДАБр. – Ф.2001. – Воп. 1. – Спр. 3. Спісы солтысаў і іх намеснікаў у гмінах Пінскага павету.
7. ДАБр. – Ф.2001. – Воп. 4. – Спр. 105. Месячныя і штодзённыя справаздачы кіраўніку ІІ раёну і гміннага праўлення аб грамадска–палітычным становішчы.
8. ДАБр. – Ф.2001. – Воп. 4. – Спр. 100. Загад №1 кіраўніка Белагвардзейскай групы Балаховіча, захоп г. Пінска і яго ваколіц.
9. Стужынская, Н. Беларусь мяцежная: з гісторыі ўзброенага антысавецкага супраціву / Н. Стужынская. – Вільня: 2000. – 256 с.